# Слова пра сябра

20 жніўня гэтага года, напярэдадні святкавання 20-х угодкаў абвяшчэння беларускай незалежнасці, адышоў у лепшы свет знакаміты беларускі гісторык, архівіст, публіцыст, краязнавец і грамадскі дзеяч Віталь Скалабан. Лёс звёў мяне з гэтым унікальным чалавекам у 80-я гады мінулага стагоддзя, калі ён працаваў у рэдакцыі Беларускай Энцыклапедыі. Дзякуючы яму і нашаму старэйшаму сябру Міхасю Ткачову выйшлі ў свет шматтомная гістарычная энцыклапедыя Беларусі, Энцыклапедыя археалогіі і нумізматыкі Беларусі і іншыя энцыклапедычныя выданні.



Віталь Скалабан быў адным з самых дасведчаных і прафесійных краязнаўцаў. Менавіта ён падрыхтаваў і выдаў унікальны том кнігі "Памяць", прысвечаны яго роднаму Ляхавіцкаму раёну, распрацаваў тэму радзімазнаўства, гісторыі беларускіх гарадоў і мястэчак, выкладаў курс гістарычнага краязнаўства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Як гісторык і архівіст В. Скалабан вывучаў гісторыю Беларусі XX ст., вытокі стварэння БНР і БССР, "Літбела" і "Сярэдняй Літвы", біяграфіі знакамітых беларусаў канца XIX – першай паловы XX стст. Менавіта ён у суаўтарстве з Людмілай Рублеўскай напісаў п'есу "Людвіка і Фабіян", у якой ідзе гаворка аб каханні Зоські Верас і Фабіяна Шантыра, дзеячоў беларускага адраджэння пачатку XX ст.

В. Скалабан знайшоў першую каляровую выяву бел-чырвона-белага сцяга на ўлётцы 1917 года, якую выпусцілі беларусы-вайскоўцы на Румынскім фронце.

Вялікая роля В. Скалабана ў стварэнні БСДГ. Працуючы разам з Міхасём Ткачовым, Скалабан рашуча выступаў за аднаўленне беларускай сацыял-дэмакратыі менавіта на нацыянальнай глебе, на прыкладах беларускіх грамадоўцаў пачатку XX ст., ініцыятараў абвяшчэння БНР у 1918 годзе.

Калі ў 1995 годзе да кіраўніцтва у БСДГ прыйшлі людзі, якія вырашылі павярнуць курс партыі ў "левы" бок і пайшлі "яднацца" ў адзін блок з маргінальнымі палітычнымі групоўкамі на чале з Караваічыкам і Булахавым у домемузеі I з'езда РСДРП, Скалабан узначаліў у БСДГ "фракцыю за захаванне Грамады" як партыі беларускіх адраджэнцаў, а не левых марксістаў-авантурыстаў. Сённяшні глыбокі крызіс беларускай сацыял-дэмакратыі Скалабан прадбачыў ужо ў 1995-1998 гадах. Не жадаючы ўдзельнічаць у шматлікіх партыйных спрэчках, пасля 2010 года ён адышоў ад партыйнага жыцця.

Калі я быў дэпутатам ВС 12 склікання, Віталь стаў маім памочнікам і дарадцам у 33-й Мірашнічэнкаўскай акрузе г. Менска. Яго невялікая кватэра на вуліцы Мірашнічэнкі побач з Курапатамі была нашым штабам, дзе мы працавалі з выбаршчыкамі, арганізоўвалі розныя мерапрыемствы, збіралі подпісы за розныя дэмакратычныя ініцыятывы.

З 2002 года Скалабан перайшоў на сталую працу ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Узначальваючы аддзел публікацыі дакументаў, ён адшукаў і надрукаваў невядомыя раней дакументы, звязаныя з дзейнасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа, сабраў унікальныя матэрыялы для літаратурнага музея імя Максіма Багдановіча. Асобная тэма, якую ўдала распрацаваў Віталь Скалабан, - гэта ахова і знішчэнне нашай культурнай спадчыны, асабліва падчас Другой Сусветнай вайны. Ён надрукаваў дзённік тагачаснага кіраўніка Беларусі Панамарэнкі, матэрыялы пра лёс крыжа Ефрасінні Полацкай, спіс экспанатаў Беларускага дзяржаўнага музея і карціннай галярэі, якія былі вернуты з Германіі ў СССР у 1947 годзе. У дакументах 1948 года, знойдзеных і надрукаваных Скалабанам, апісанне вернутых каштоўнасцей было больш дакладным, чым яно было зроблена потым. Шмат цікавых публікацый даследчыка было прысвечана дзейнасці Доўнар-Запольскага, Улашчыка, Гарэцкага, Ігнатоўскага і Платонава.

Склабан добра ведаў і актыўна карыстаўся беларускай мовай, быў сябрам ТБМ, цікавіўся тэмай беларусізацыі ў 20-я гады мінулага стагоддзя. Яго апошнім жаданнем быў беларускамоўны надпіс на сваім надмагіллі.

Было б добра ўшанаваць памяць пра Віталя Скалабана ў назвах вуліц у яго родных Ляхавічах і ў Менску, дзе ён пражыў значную частку свайго жыцця.

*Алег Трусаў.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ISSN 2073-7033

700-ты нумар "Наша